ЗГОДА

ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК
http://www.zgoda-weekly.org

№ 12(287) 29 сакавіка — 3 красавіка 2003 г.

ПО ПОВОДУ

ПОЛИТИКА ПОСТМОДЕРНИЗМА



НАШ ВЕРНИСАЖ. «В Багдаде все спокойно», художник АЛЕКСАНДР СДВИЖКОВ-ДАЛИ

АЛЕКСАНДР СДВИЖКОВ

Мне кажется порою (здесь даже крестное знамение не помогает), что в XXI веке эстетика постмодернизма станет общим знаменателем политической жизнедеятельности так непохожих друг на друга стран и народов мира.

Вторжение англо-американских союзников в Ирак стало спонтанным и естественным внешнеполитическим деянием. И одновременно абсолютно неограничной акцией для сложившейся к настоящему времени системы международно-правовых отношений. Столь тяжеловесным и далеко не эстетичным парадоксом можно дифференцировать реакцию мировой политической элиты на новую Войну в Заливе.

По большому счету, политика – штука малоэстетичная. Она весьма далека от технической эстетики любых более-менее связных и развернутых концепций, пытающихся навязать людям свою модель обустройства современного мира.

Чаще всего для упрощенного объяснения картины мира принято рассуждать с позиций конструктивизма в духе прусской мобилизационной эстетики генерала Клаузевица – война есть продолжение политики. Или в стиле Ульянова (Ленина), чисто по-модернистски интерпретировавшего философствования прусского генерала, – внутренняя политика есть продолжение внешней, и наоборот.

Именно от модернизма с добавлением значительной толики марксистского экономического детерминизма происходит большая часть экспликативных рассуждений яйцеголовых комментаторов о нынешней американской попытке умиротворить Ирак и его диктатора.

Имя модернистам – легион. Как тем, кто пытается объяснить новую Войну в Заливе исключительно нефтяным интересом США. Так и тем, кто изрекает имбецильные сентенции на тему так называемого *«однополярного мира»*.

Между тем нефтяные детерминисты едва ли представляют себе, что три процента, добываемого в Ираке углеводородного сырья, оказывают минимальное воздействие на мировые цены на нефть. И еще в меньшей степени сказываются на народном хозяйстве североамериканских штатов.

Тогда как ненавистники американской однополярности, прежде всего их пацифистская составляющая, нисколько не отдают себе отчета в том, что ностальгируют по временам глобального противостояния двух полюсов, СССР и США, не раз и не два ставивших мир на грань военной катастрофы и ядерной зимы.

От нефтяных и однополярных модернистов трудно ждать иного. Поскольку только что закончившийся XX век был эпохой тотального доминирования модернистских концепций, пытавшихся самым бунтарским и революционным образом изменить картину окружающего мира.

В прошлом веке случалось, когда модернисты-революционеры брали политическую власть и реализовывали на практике свое бунтарство. *«Мы на горе всем буржуям мировой пожар раздуем»*. Лучше всего это удалось немецким национал-социалистам. Хотя и прочие адепты социалистических доктрин по всему миру поддерживали огонь войны в череде локальных войн, особенно участвовавшихся во второй половине XX века.

Не стала в этом ряду исключением и Партия арабского социалистического возрождения, чей революционный вождь Саддам Хусейн, на манер КПСС, руководил и заправлял своей страной. Он долго и упорно воевал с соседями. И в конце концов вызвал огонь на себя и страну.

Выбор иракской цели антитеррористической коалицией был неминуем после умиротворения афганских талибов. Исламские камикадзе, посеяв 11 сентября 2001 года отнюдь не божественный ветер, теперь пожинают мировую бурю.

Это – уже не «Буря в пустыне», так и не достигшая ворот Багдада в 1991 году. Поскольку тогда у американских и английских войск были связаны руки мандатом Совбеза ООН.

Теперь доминирующая в мире англосаксонская цивилизация предельно асимметрично отвечает на вызов исламских модернистов. Именно так! Поскольку в одежды традиционализма сегодня рядятся типичные революционеры.

Что для исламских бунтарей метафоричные суры Корана, что наобум взятые туманные выдержки из «Капитала» для российских большевиков – им все едино. А классицизм в форме простого цитатника типа красной книжечки Мао или «Зеленой книги» Каддафи мусульманским модернистам без надобности. Чем непонятнее текст идеологического заклинания, тем легче он усваивается прозелитами-модернистами, для которых революционная практика выступает единственным мерилом политического бытия.

Но модернистам не дано понять усложненность и парадоксальность современной политики. Тем более, когда политика, подобно западной постмодернистской архитектуре, отрицает замшелый утилитаризм и кондовый гуманизм ушедшего века.

Отныне политика, направленная на достижение глобального порядка, основывается на идеалистических, а не материалистических представлениях об историческом времени и межгосударственном пространстве.

Никак нельзя поверить в новый англосаксонский идеализм прагматикам и материалистам. Вот и находят они вроде бы рациональные, но по-детски наивные объяснения военно-политической активности союзников.

Те, кто одобряет действия антииракской коалиции, уверены, что коль скоро англосаксы достигли блистательных высот экономического и политического благоденствия, то они имеют право навязывать свой образ жизни всем странам мира. Так родители, умудренные опытом и благоприобретенным достатком, наставляют на путь истинный неразумных отпрысков. Им внимают, поскольку послушание старшим суть обетования в будущем блага. Те, кто осуждает Войну в Заливе, столь же инфантильны.

Окончание на стр. 3 ➲

С ДРУГОГО БЕРЕГА

Война и мир

СЕРГЕЙ КОРОЛЬ,
Филадельфия

Впервые после окончания второй мировой войны США начали военные действия против суверенного государства. Не в ответ на агрессию, не из-за обязательств перед союзником, и даже не с целью вмешаться во внутренний конфликт. Войну начали при отсутствии единственного в международном праве условия применения военной силы в целях, отличных от оборонных, — мандата Совбеза ООН.

Военная операция США разительно отличается от интервенционистских вмешательств второй половины XX века, больше напоминая войны около столетия назад, когда силовые политики Европы начинали войны, руководствуясь жесткими соображениями национальных интересов. Именно суверенным правом на применение военной силы для защиты национальных интересов и объяснил свою позицию в ультиматуме Саддаму Хусейну президент Буш.

Сто лет назад силовые проявления национальных интересов сопровождались массовым подъемом национального духа, смеси гордости своим и ненависти к чужому. Каково же настроение американской нации сегодня, в первые дни начала этой новой-старой войны?

Выборы 2000 и 2002 годов в США дали миру нацию фифтифифти, четко разделенную по линии «красивых» и «ответственных»: безбожных либералов, прибрежных горожан и верующих сельских консерваторов из внутренних штатов. Большинство находящихся между этими полюсами проживающих в пригородах американцев, которых меньше интересуют ценности, а больше работа и школа, также поделились почти поровну между демократами и республиканцами. Поскольку именно этой середине и принадлежит решающий голос, за нее и идет самая жесткая предвыборная борьба.

В канун выборов в конгресс в ноябре 2002 года, республиканской партии удалось перехватить из середины несколько процентов. Удалось качнуть, хотя и незначительно, многолетний баланс благодаря умело разыгранной карте национальной безопасности.

В условиях постсентябрьской психологической травмы и преследующих американцев чувств национальной обиды и незащищенности, жесткая республиканская позиция против внешнего врага (в том числе Саддама) оказалась важнее, чем социальные лозунги демократов. Но условие избиратели поставили четкое: если война, то только с союзниками и с мандатом ООН.

Опросы стабильно показывали число сторонников войны в районе 70 процентов. Но не менее стабильной была цифра 67 – процент тех, кто соглашался с необходимостью военных действий только при условии одобрения ООН и в рамках международной коалиции.

Такое мнение большинства было главным фактором, подвигнувшим Буша прислушаться к Колину Пауэллу и пойти через ООН вопреки настойчивым советам вице-президента Чейни, который всегда говорил, что из обращения к Совбезу ООН ничего не выйдет.

Теперь, когда война началась, барометр общественного мнения перевернулся, и 70 процентов американцев целиком и полностью поддерживают действия президента Буша. Почему такая перемена?

Одна причина – в разочаровании американцев ситуацией в ООН в преддверии конфликта. Американцы чувствовали себя обманутыми международной системой принятия решений, которая, казалось, была задумана специально для того, чтобы заблокировать американскую дипломатию.

Особенно задело американскую общественность неконструктивное поведение Франции, за которым публике виделось тщеславное и необоснованное стремление поиграть в сверхдержаву и ослабить позиции США любой ценой, даже если и через косвенную поддержку иракского диктатора.

В свете того, что именно США несли на себе расходы на главное средство давления на Саддама – войска в регионе, и именно американские солдаты шли бы против него в бой – такая позиция задела нацию за живое. Разочарование американцев бессилием организации, мандат которой они поставили в условие ведения войны, можно понять.

Конечно, с европейской точки зрения, трудно уразуметь ту настойчивость, с которой американцы упирали на разоружение Ирака военным путем, с ООН или без нее. Европейцев не удалось убедить в том, что между 9/11 и Саддамом Хусейном существует прямая связь. Ни прямых, ни косвенных доказательств сотрудничества Хусейна с бен Ладеном найдено не было.

Окончание на стр. 4 ➲

АНЕКДОТ-С

Саддам приказывает поднять всю авиацию, чтобы отразить англо-американское наступление. А генералы ему говорят, что нельзя – летчик заболел.

***

– Почему иракское посольство отказалось субсидировать поездку белорусских пацифистов для использования их в качестве «живого щита»?


– Чтобы не создавать еще одну рентабельную цель для авиации союзников.

***

– Что главное в союзе Беларуси и России?


– Главное – стереть границу между российским рублем и белорусским, между Хатынью и Катынью, между водопроводом и канализацией.

ХИТ-ПАРАД ГЛУПОСТИ



«Беларусь не должна вести себя агрессивно ни к одной из сторон»

(А. Лукашенко, Пресс-служба ПРБ, 24.03.03)



«Сегодня культурология представляет собой одно из самых перспективных направлений гуманитарного и социального знания»

(доцент В. Языкович, «Народная газета», 25.03.03)



«Перспектыўна ж псіхологія сацыяльнага партнерства грамадзяніна і дзяржавы»

(У. Дражын, «Рэспубліка», 26.03.03)

НАВІНЫ

Пікет. Пікетаванне беларускай амбасады ў Кіеве прайшло 25 сакавіка. Гэтай акцыяй прадстаўнікі дэмакратычнай грамадскасці выказалі салідарнасць з беларускай апазіцыяй, якая ў гэты дзень адзначае 85-я ўгодкі абвешчання Беларускай народнай рэспублікі. Сярод арганізатараў акцыі – *«Молодий Рух»*, *«Самостійна Україна»*, *«Український Молодіжний «Собор»* і іншыя арганізацыі. У знак пратэсту супраць планаў Крамля ўвесці ў Беларусі і Украіне расійскую валюту публічна спаленыя расійскія рублі. Таксама ў амбасаду перададзена публічная заява з заклікам вызваліць беларускіх палітвязняў. Заяву падпісалі некалькі дэпутацкіх груп Вярхоўнай рады. Збор подпісаў працягваецца.

Смерць. 23 сакавіка на 53-м годзе жыцця раптоўна памёр вядомы грамадскі дзеяч, дырэктар грамадскага аб'яднання «Магілёўскі праваабарончы цэнтр» Сяргей Абадоўскі. Пахаванне Сяргея Абадоўскага адбылося ў Магілёве 25 сакавіка а 13-й гадзіне на могілках у раёне вуліцы 30 год Перамогі.



Пахаванне. У Мінску адбылося пахаванне былога старшыні Вярхоўнага савета БССР, першага амбасадара незалежнай Беларусі ў Польшчы, кіраўніка рэвізійнай камісіі Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная грамада) Георгія Таразевіча. Ён раптоўна памёр 21 сакавіка, уначы з пятніцы на суботу. У развітанні ўзялі ўдзел экс-старшыні беларускага парламента Станіслаў Шушкевіч і Мечыслаў Грыб, кіраўніцтва БСДП (НГ), прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі краіны. Пахавалі Георгія Таразевіча на Усходніх могілках.

Прызначэнні. Аляксандр Лукашэнка прызначыў Сяргея Мартынава, амбасадара ў Бельгіі і сталага прадстаўніка Беларусі ў Еўразвязе і *NATO*, міністрам замежных спраў. Былы міністр замежных спраў Міхаіл Хвастоў зрабіўся надзвычайным і паўнамоцным амбасадарам ў Злучаных Штатах Амерыкі і па сумяшчальніцтву амбасадарам у Мексіцы. Сяргею Мартынаву Лукашэнка даручыў узмацненне супрацоўніцтва з Расіяй, аздараўленне еўрапейскага накірунку знешнепалітычнай дзейнасці, выпраўленне стасункаў з ЗША, нягледзячы на складаную міжнародную сітуацыю.

Скарга. Цэнтральны раённы суд Мінска адмовіўся разглядаць скаргу Вольгі Завадскай на дзеянні пракуратуры. Суддзя прапанаваў маці зніклага аператара ОРТ Дмітрыя Завадскага скардзіцца на пракуратуру ў саму пракуратуру. Вольга Завадская і яе адвакат лічаць гэта грубым парушэннем канстытуцыі. Два тыдні таму Вольга Завадская, расчараваная прыпыненнем справы аб знікненні сына, падала на пракуратуру Беларусі скаргу ў суд Цэнтральнага раёна Мінска. Жанчына заявіла, што былі парушаны яе правы як пацярпелай: яе нават не пазнаёмілі з пастановай аб прыпыненні расследавання. Яна запатрабавала аднавіць следства і пакараць вінаватых у парушэнні закона. Суддзя Пётр Кіркоўскі з Цэнтральнага суда Мінска ў пісьмовым адказе паведаміў Вользе Завадскай, што яе скарга ў судзе разглядацца не будзе. Вольга Завадская ўспрыняла гэтую адмову як яшчэ адзін доказ нежадання ўладаў высвятляць лёс сына.

Антырасізм. Грамадскае аб'яднанне «Маладая грамада» правяло 21 сакавіка дыскусію «Разам супраць расізму». У гэты ж дзень «Маладая грамада» ўшанавала памяць ахвяраў нацысцкага рэжыму ўскладаннем кветак да помніка ахвярам гітлераўскага генацыду. 23 сакавіка сябры арганізацыі правялі акцыю па знішчэнні расісцкіх лозунгаў са сцен будынкаў Мінска. *«Расізм у сённяшнім свеце разумеецца не толькі як варожасць да людзей іншай расы, а ўвогуле да людзей, якія належаць да іншай сацыяльнай групы – прыкладам, да нацыянальных і культурных меншасцяў, да жанчын. Дыскрымінацыя па полавай прыкмеце таксама з'яўляецца праявай расізму. У нашай патрыярхальнай краіне мала хто нават задумваецца над тым, што мы жывем у грамадстве, якое нас дыскрымінуе»*, – казала старшыня арганізацыі Таццяна Алесіна. 15–23 сакавіка адзначаецца як агульнаеўрапейскі тыдзень барацьбы з расізмам. Лозунг тыдня: «У аснове ўсе мы аднолькавыя: глядзі глыбей!»

Анонс. 28 – 30 сакавіка ў Мінску і Нясвіжы пройдзе дабрачынны фэст «Музыка замкаў і ваколіцаў». Усе сродкі, атрыманыя ад продажу квіткоў, пойдуць на аднаўленне Нясвіжскага замку, пашкоджанага пажарам пры канцы мінулага года. У рамках фэсту пройдуць тры канцэрты, два з якіх у ДК «Юнацтва» (вул. Фабрыцыуса, 5 у Мінску), а заключны – ў Нясвіжы. Удзел у канцэртах бяруць вядомыя беларускія і расейскія фольк-гурты «Троіца», «Стары Ольса», *«Drolls»* і *«Laterna magica»*. «Троіца» з'явіцца перад слухачамі толькі аднойчы, 28 сакавіка, у кампаніі з *«Drolls»*. А 18-й гадзіне 29 сакавіка прыйдзе чарга выступаць гурту *«Laterna magica»* і «Старому Ольсе». Трэці дзень фэсту пройдзе ў нясвіжскім раённым доме культуры. Выступяць *«Drolls»* і «Стары Ольса». Кошт квітка на адзін дзень фэсту – 6000 рублёў.

ДЗЕНЬ ВОЛІ

Апазіцыя сышла за краты

АЛЕСЯ ГОРДЗІНА

Вулічныя акцыі па святкаваннні 85-х угодак БНР прайшлі пад знакам прэвентыўных затрыманняў. Міліцыянты хапалі апазіцыйных актывістаў да пачатку акцый, а потым сведчылі ў судзе, што тыя прымалі ўдзел у несанкцыянаваных шэсцях і выкрыквалі лозунг «Жыве Беларусь!», за які ў Беларусі кідаюць за краты.

Акцыя 23 сакавіка ля плошчы Незалежнасці ў Мінску сабрала з сотню чалавек. Калі паспрабавалі рухацца па ходніках у бок плошчы Незалежнасці, іх акружылі і пачалі закідваць у аўтобусы. Амапаўцы сціскалі кола ачаплення, не зважаючы на даўку. Журналіста Валера Шчукіна і яго ўнучку збілі з ног. Іншыя, сярод якіх была і мінчанка Святлана Ніколенка, амапаўскі націск вынес на кіёск, людзі атрымалі моцныя ўдары галавой. 17-гадовага сына Святланы Зміцера ціхары білі па жываце, пасля чаго яго моцна ванітавала. Жанчына з сынам вымушаныя былі звярнуцца ў бальніцу «хуткай дапамогі». Пры затрыманні амапаўцы выломвалі рукі, скручвалі ў дугу і кідалі на падлогу аўтобуса жанчынаў і зусім маладых дзяўчатаў. Калі «грузілі» 17-гадовага Дзяніса Чыкалёва, абцасамі да крыві здзёрлі яму руку. Іншым парвалі вопратку. Усяго ля паштамту затрымалі каля 30 чалавек, якіх даставілі ў Ленінскі РУУС.

Да пачатку акцыі людзей пачалі хапаць ля Чырвонага касцёла. Сярод іх і Ганну Сіўчык з 7-гадовым сынам сынам Вітаўтам. Хлопца пацягнулі па зямлі за каршэнь. Каля 20 затрыманых даставілі ў міліцыю Маскоўскага раёна. Пасля адпусцілі, за выключэннем Паўла Севярынца і Вячаслава Сіўчыка, якіх перапраўлі ў міліцыю Ленінскага раёна.

З'яўленне апошніх адзначылася знанай падзеяй. Упершыню ў міліцэйскіх сценах прагучаў неафіцыйны беларускі гімн «Магутны Божа» ў выкананні затрыманых. Прычым справакавалі гэта самі міліцыянты, якія пачалі чапляцца да затрыманых: маўляў, што вы абараняеце ды што ў вас за гімн. «*Усе падымаюцца і мы спяваем «Магутны Божа»*, – распавёў Павел Севярынец. – *Міліцыянты раскрываюць рты, стаяць моўчкі шакаваныя і глядзяць. Пасля хвіліна маўчання. І больш дачэпак ніякіх не ўзнікала, размаўлялі больш паважліва. Таму што спявалі сапраўды добра, моцна. Ну яшчэ і акустыка, актавая зала»*.

На наступны дзень суд Ленінскага раёна размяркоўваў пакаранні. Самым анекдатычным быў разгляд справы Паўла Знаўца. Яго яшчэ да пачатку акцыі «запрасіў» у аўтобус міліцэйскі начальнік Вараб'ёў. На судзе ж амапаўцы Сяргей Ліпінскі і Анатоль Русаковіч заявілі, што Знавец прымаў у несанкцыянаваным мерапрыемстве самы актыўны ўдзел. На хадайніцтва Паўла запрасіць спадара Вараб'ёва, а таксама праглядзець аператыўныя здымкі акцыі, якія б выкрылі хлусню міліцыянтаў, суддзя адмовіў і прысудзіў Знаўцу 10 сутак арышту, нягледзячы на тое, што ў Паўла хранічны гепатыт. Па той жа схеме і з такім тэрмінам зняволення скончыўся разгляд справы Паўла Севярынца, якога таксама затрымалі да пачатку акцыі. Вячаслаў Сіўчык атрымаў 15 сутак, Валянцін Баранаў – 14. Усяго ў Акрэсцінскі спецпрыёмнік-размеркавальнік з рознымі тэрмінамі зняволення адправілі 11 чалавек, 6 атрымалі штрафы, 7 – папярэджанні.

Такім чынам, спраўдзіліся прагнозы крытыкаў, якія даводзілі, што апазіцыі трэба пераадолець амбіцыі і праводзіць аднудзве акцыі супольнымі сіламі. Гэта пераканаўча паказала і акцыя 25 сакавіка, якую праводзіў БНФ на чале з Вінцуком Вячоркам.

На плошчы Якуба Коласа сабралася тая ж дзве-тры сотні людзей. Як вядома, раней арганізатары планавалі прайсці да помніка Янку Купалу і ўскласці кветкі. Вінцук Вячорка, на здзіўленне прысутных, заклікаў усіх разысціся, каб не правакаваць міліцыю. Адбылося толькі ўскладанне кветак да помніка Якубу Коласу. Амапаўцы павольна шыхтам прайшліся па плошчы, ненавязліва выцясняючы людзей. Пасля чаго па камандзе селі ў аўтобусы і з'ехалі. Нешматлікія купкі людзей прастаялі яшчэ гадзіну і разышліся.

Паслухмянасць заяўнікаў перад міліцыяй не выратавала іх. Вінцук Вячорка і кіраўнік гарадской арганізацыі БНФ Уладзімір Кішкурна былі затрыманыя. 15 чалавек схапілі да пачатку абвешчанай акцыі. На момант падпісання газеты ў друк было вядома, што ўсіх караюць суткамі. Вячорка атрымаў 10 сутак, Яўген Афнагель – 15, Таццяна Ялавая і Ігар Віннікаў – па 5 сутак.

Такім чынам, зараз амаль уся апазіцыя сядзіць за кратамі. Як вядома, на Акрэсціна знаходзяцца і арганізатары маршу 12 сакавіка – Андрэй Саннікаў, Зміцер Бандарэнка, Людміла Гразнова і Леанід Малахаў. Каардынатар руху «Зубр» Цімафей Дранчук, які прынёс ім газеты 25 сакавіка, сам стаў затрыманым на падставе таго, што ў мінулым годзе ён не адсядзеў тэрмін за адну з акцыяў. Зняволенне цалкам незаконнае, бо тэрмін выканання адміністрацыйнага правапарушэння скончыўся.

Ці зробіць апазіцыя высновы з сваіх разладаў? Пакуль жа яе «гарачая вясна» паказвае мінусавую тэмпературу.

■

ВЫСТАВА

«Пагоня» ва ўправе

МІКАЛАЙ КАРНЕЙЧУКОЎ

Традыцыйная выстава суполкі «Пагоня», сёлета прымеркаваная да 85-х ўгодак БНР, адчынілася ва ўправе БНФ, а не ў Палацы мастацтваў, як звычайна. Бачна, што за год, які прайшоў з мінулай выставы, адносіны ўладаў да «Пагоні» не палепшыліся.

Дзіўна, але гэтая выстава пагонеўцаў як ніколі па-за палітыкай. Хіба толькі бела-чырвона-белы сцяг ды *«Советская Белоруссия»* Янкі Рамановіча – крывавыя плямы на зялёным фоне ды блёклыя абрысы сярпа і молата пасярэдзіне – цягнуць на ідэялагічную нявытрыманасць.

У адрозненне ад маладога ды гарачага мастака з Мотыля, сталы Генадзь Драздоў на фоне шматплоскаснай гульні колераў пад назвай «Час паспеўшага плода» змясціў аб'ёмную сакавітую дулю. Побач – свежая і вельмі нечаканая карціна ад Алеся Марачкіна «Кампазіцыя-2».

Пасля доўгіх намаганняў убачыць нешта сярод рознага кшталту ліній, думкі ў гледачоў знікаюць, застаюцца адны пачуцці. Здаецца, баючыся застацца незразумелым, мастак, як герой адной савецкай песні, дадаў да малюнка колькі словаў. А каб даведацца, што гэта за словы, зайдзіце на Варвашэні, 8!

Ёсць сярод партрэтаў Сяржук Сокалаў-Воюш з гітарай, ёсць Міхась Ткачоў з паходняй. Знайшлося ў цеснаватай, але і цёплай залі месца для самотнай Ларысы Геніюш з Прагі 30-х гадоў. У самым куце – пейзажы Алеся Шатэрніка, з якіх пазірае зіма 2003-га. Апошні раз, на развітанне.

■

АДУКАЦЫЯ

Што адбываецца?

ЮЛІЯ ДРАНЧУК

«Школа й грамадзтва» — практычная канфэрэнцыя з такім назовам адбылася 22–23 сакавіка ў Менску ў Міжнародным адукацыйным цэнтры. На думку адмыслоўцаў, беларуская школа сёньня застыла ў форме пад назовам «нічога не адбываецца» і ўзяла на сябе функцыю *«захаваньня дзіцяці ад жыцьця»*. На мэце мерапрыемства было акрэсьліць прафэсыйныя праблемы настаўнікаў і шляхі іх вырашэньня.

Арганізатары канфэрэнцыі «Школа й грамадзтва» – шматлікія арганізацыі Беларусі і Польшчы. Сярод іх былі фундацыя Стэфана Баторыя, Усходнеэўрапейскі дэмакратычны цэнтар, МГА «Зваротная сувязь», МГА «Новая Касталія» ды іншыя.

Беларускія і польскія адмыслоўцы ў галіне адукацыі выклалі ўласны погляд на сёньняшні стан беларускай школы ў кантэксьце сусьветнага досьведу. Іхная аўдыторыя была шматлікая – з розных куткоў Беларусі зьехаліся каля 100 настаўнікаў, каб абмяняцца досьведам і абмеркаваць далейшыя пэрспэктывы. Пасьля гучнай дыскусіі адбыліся практычныя заняткі ў сэкцыях, прысьвечаныя тэмам школьнай рэформы ў Беларусі, адукацыйнаму супрацоўніцтву Беларусь–Польшча і дэмакратычнаму рэфармаваньню школы і грамадзтва.

Агульны настрой настаўнікаў і адмыслоўцаў адукацыі быў пэсымістычны. Нерухомасьць, антыгнуткасьць і аморфнасьць беларускай школы, закрыцьцё беларускіх школаў (цяпер зачынена болей за 150 па краіне), адсутнасьць альтэрнатыўнай адукацыі, жабрацкае фінансаваe становішча і дзіўнаватыя падручнікі, далёкія ад рэчаіснасьці – гэткая палітра праблемаў сапраўды не спрыяла аптымізму.

Вось як скрушна канстатаваў загадчык «Цэнтру праблемаў разьвіцьця адукацыі» БДУ дацэнт Мікалай Гусакоўскі:

– Адбываецца пэўная неадчувальнасьць і зачыненасьць навучальных установаў Беларусі да сацыяльна-культурных зьменаў краіны. Я ня бачу розьніцы ў гэтым аспэкце паміж вышэйшай і сярэдняй школамі. Нешта адбываецца звонку, але школа аніяк на гэта не рэагуе, ігнаруючы падзеі. Гэта папросту не абмяркоўваецца, і няма месца, дзе гэта магло б абмяркоўвацца. Ёсьць навучальная праграма, навучальны плян, настаўнік прыходзіць на ўрок і пачынае распавядаць з таго месца, на якім скончыў тэму мінулым разам. Усё гэта, натуральна, прыводзіць да адной дзіўнай сытуацыі: адукацыя – ня сродак разьвіцьця грамадзтва, а сродак аховы дзяцей ад жыцьця. У адукацыю ідуць, каб адцягнуць працэс пераходу да сацыяльнай актыўнасьці. Я сам бачыў навучальныя пляны, у якіх папросту закрэсьліваецца слова «спэцыяліст» і на ягоным месцы пішуць «магістар». Ці «бакаляўр» – залежна ад асабістых густаў таго, хто ёсьць выканаўцам гэтае працы. І ўсё. Болей, апроч формы, нічога не мяняецца.

Афіцыйнае стаўленьне да праблемаў школы на канфэрэнцыі выказваў Мікалай Ліс, загадчык інфармацыйна-аналітычнага ўпраўленьня Міністэрства адукацыі. Каб напісаць сапраўды якасныя падручнікі, патрэбныя гады, гады і яшчэ раз гады, лічыць спадар Ліс.

На пытаньне пра стан галечы, у якім знаходзяцца школы і адукацыя наагул, службовец Ліс скрушна пагадзіўся, але падкрэсьліў:

– Дзяржава ў гэтым не вінаватая. Мы маем вельмі маленькі бюджэт. Значыцца, вінаватыя мы з вамі, а не дзяржава. Ну, лёс у нас такі. Правільна?

У адказ на далёка не рытарычнае пытаньне ў шэрагах настаўнікаў пранесься шэпат: «*Не, ня правільна*»...

■

ПО ПОВОДУ

➲ Окончание. Начало на стр. 1

Политика постмодернизма

Так как по-детски требуют позволить жить им самим или иракцам как заблагорассудиться и тем, и другим. Пусть плохо, но по-своему. Поэтому, глядя на боевые действия в иракской пустыне, они искренне недоумевают. Оба-на, что они там творят? И эти люди не дают нам ковырять в носу!

Увы, политика – не детская забава. Ее правила сложны и взаимозависимы. Это – постмодернистская игра для взрослых. Глупые дети играют в мяч, а умные взрослые – в профессиональный спорт. Взрослые недоумки играют в карты, но только профессионалам доступно интеллектуальное удовольствие от игры в бридж беллот или преферанс.

Кураж профессиональных игроков в политику всегда рассчетлив. Но им не дано предугадать, как слово наше отзовется. От беспристрастных аналитиков они не дождуться ни сочувствия, ни благодати. Хотя бы потому, что наше ехидство насчет здоровья Буша или Хусейна они обязательно отвечают: «Не дождетесь!»

Впрочем, теперь повсюду встречаются перелицованные анекдоты в лучшем стиле литературного постмодернизма постсоветской России. Скажем, русский Путин борется за мир и госбезопасность во всем мире ничуть не менее активно, чем в свое время за них хватался советский Андропов.

Даже белорусский Лукашенко прогундосил об *«американской агрессии»* в духе совкового передовика производства. Помнится, таких ударников комтруда парторги обязывали на заводских митингах по бумажке, клеймить позором всякие сионизмы-империализмы.

Жаль только, что белорусский президент и его помощники не перепутали бумажки, подобно персонажам Галича. Представьте себе, как из уст Александра Лукашенко вдруг вылетает эдакое литературно-анекдотическое: *«Обещаю вам как мать и как женщина»*. Это был бы лучший парадокс политики постмодернизма. ■

АД ПЕРШАЙ АСОБЫ

«Я не захварэў на страх»

На мінулым тыдні ў Гродна з «хіміі» вярнуўся другі журналіст, асуджаны па справе «паклёп на прэзідента». Павел Мажэйка адказвае на пытанні нашага карэспандэнта Алесі Гордзінай.

– Павел, як вы правялі першыя дні дома?

– Я 15 гадзінаў ехаў у цягніку, было страшэнна халодна, і захварэў. І першыя два дні адлёжваўся. Праўда, увесь час несупынна тэлефанавалі.

Мне вельмі спадабаўся нумар «Нашай нівы», які атрымаўся прарочым. Ён выйшаў з маім здымкам з-за кратаў, і было напісана «Дзень Волі». Якраз у гэты дзень, як выйшаў нумар, мяне і вызвалілі.

Сябры паведамілі бацькам, што я прыязджаю, бо я сам не здолеў. І мне падрыхтавалі святочны стол, я наеўся, што называецца, за ўсе 6 месяцаў. А цяпер хаджу па міліцыях, адзначаюся, на ўлік станаўлюся.

– Як на вас адбілася «хімія»?

– На пілараме, дзе я працаваў, калі на яе запускаюць бервяно, яно можа выйсці або ў выглядзе дзесятка дошак, або грунтоўным брусам. Я выйшаў з «хіміі» такім брусам. Адкінуўшы шалупіньне, нейкую свою няўпэўненасць, няверʼе, магчыма, непаразуменне ў самім сабе. Абсалютна нязломленым ні воляй, ні духам, з жаданнем актыўна жыць, працягваць прафесійную дзейнасць, грамадскую таксама. Я лічу гэта сваёй асабістай перамогай.



– Значыць, адпраўляючы вас на «хімію», улады сваёй мэты не дасягнулі. Вы не «перавыхаваліся»?

– На судзе, які вырашаў, вызваліць мяне датэрмінова ці не, прагучала, што Павел Мажэйка сваімі паводзінамі даказаў сваё выпраўленне. Хаця я абсалютна не прызнаў сваёй віны, і тым больш не стаў на нейкі шлях выпраўлення. Ад чаго мне было выпраўляцца?

– Раней вы казалі, што схуднелі на 8 кілаграмаў...

– Пасля першых двух месяцаў. Там даволі складана з харчаваннем. І досыць складана гатаваць. У блоку пражывае 5-7 чалавек. І адна плітка, якая награвацца 40 хвілінаў. Мы гатавалі суп, які стараліся рабіць так, каб гэта было адразу і першае, і другое. Максімальна макаронаў, бульбы. Здароўе там пасадзіць элементарна.

– Пра працу яшчэ не думалі?

– Толькі ж прыехаў. Для Міколы Маркевіча праца абавязковая з адлічэннем 15 адсоткаў ад заробку ў даход дзяржавы. У мяне ж умоўна-датэрміновае вызваленне ад пакарання. Калі на працягу далейшых пяці месяцаў я не здзейсню трох парушэнняў, то з 2 верасня я буду лічыцца абсалютна вольным чалавекам.

Ува мне не зʼявіўся ўнутраны цэнзар. Моманту засцярогі – а ці не сяду я зноў, калі я штосьці напішу – не будзе. Страха перад далейшымі рэпрэсіямі ў мяне не зʼявілася. Гэта вельмі важная высноўва, якую я зрабіў.

У бліжэйшыя дні збіраемся з Міколам Маркевічам зʼездзіць да Івашкевіча. Пабыўшы ў гэтай скуры, разумееш, што любая падтрымка з любога куточка Беларусі ці свету – настолькі істотная, надае сілы, энэргіі. Таму мы адкладваць далёка не будзем, толькі вось з міліцыяй разбярэмся. ■

ВОКРУГ КУЛЬТУРЫ

Белорусская выставочная деятельность

НАТАША СЕРГЕЕВА

На Всебелорусском собрании интеллигенции художник Алесь Марочкин говорил о введении в стране контроля и координации за выставочной деятельности. Проще говоря, о воссоздании детища советской системы — выставкомов.

Попытки контролировать художников со стороны государства были особенно сильны при советской власти. Страх перед независимостью творческой и мыслящей личности, которая может стать рассадником неуправляемых системой идей, – вот первопричина такого контроля. Именно для этого был создан союз художников (как, собственно, и все остальные творческие союзы), который художников пересчитал и прикормил кое-какими материальными благами. Для этого придумали и систему оплаты труда творческой личности – государственные заказы, которые позволяли насаждать в искусстве определенную тематику.

Темы были разными, и талантливые люди таки находили для себя в них укромное местечко. Кроме ленинской и военной тематики, например, существовал любимый многими живописцами пейзаж, область чистого искусства. И, конечно, важную регулирующую функцию выполняли выставкомы, имевшие право допускать или не допускать работы художников на выставки. И не столько по причине слабости художественного исполнения, а из-за идейных и тематических ошибок. Не в пример нынешнему времени, тогда особо и искренне ценилось участие в республиканских выставках, допуск на которые давал привилегии на госзаказ и безбедное существование.

Если руководством обозначалась тема для республиканской выставки «Мы строим коммунизм», выделялись деньги на закупку картин с экспозиции, все художники дружно строили коммунизм. К сожалению, когда темой выставки обозначались юбилеи Богдановича, Купалы и Колоса, все также дружно посвящали свои творения *«пониманию роли поэта в формировании культурной среды нашего народа»*.

Сегодня немногие художники могут гордиться своей непричастностью к системе, тем, что они никогда не рисовали Ленина и их работы не принимались выставкомами. Таких было мало, по сути, они были духовными и моральными диссидентами.

В начале восьмидесятых было разогнано все руководство республиканского союза художников, которое пыталось неформально подходить к национальной тематике и формированию выставок. Союз обвинили в *«неправильном понимании путей развития»*, а проще, в национализме. Новое руководство, как в сказке, резко повернулось передом к советской идеологии, а к национализму – задом.

Конечно, сейчас не восьмидесятые. Но и в сегодняшней свободной для творчества стране возникают несуразные проблемы. С развалом СССР как-то естественно и незаметно исчезли выставкомы. Вседозволенность в выставочной деятельности в какой-то момент привела к хаосу. На республиканские выставки попадает огромное количество непрофессиональных и неинтересных работ. Ведь далеко не у всех художников присутствует реальная самооценка и действительный отбор по отношению к своему творчеству.

Западное общество подкинуло нам свою модель организации выставочного пространства – институт кураторства, еще не очень сильно прижившийся в республике. Куратор – тот же идейный, творческий организатор, выполняет функции жесткого критика, но уже за деньги художника и в пользу его имиджа.

В январе этого года Министерство культуры и Мингорисполком придумали неожиданный выход, создав комиссию по координации и контролю за выставочной деятельностью в городе Минске. В нее вошли представители министерства, академии искусств, союза художников, комитета архитектуры и градостроительства, детской музыкальной школы № 1, директора художественных музеев – всего 12 человек.

Функции комиссии пока никак не определены, как, собственно, и полномочия. Тем более очевидно, что люди, многие из которых известные художники и искусствоведы, заняты своей служебной работой. Поставленные в известность неожиданно, без предварительного согласия, они скорей всего не найдут время собираться перед каждым открытием каждой выставки в белорусской столице, коих набирается ежемесячно множество. За неделю в городе открывается в музеях, галереях, институтах не менее трех-четырех выставок.

Вполне возможно, что при спорности экспозиции и неудовлетворении со стороны государственных структур, именно они будут вынуждены наложить запрет и нести бремя ответственности. Причем двойное – перед министерством и перед самими художниками. Что за комиссия, создатель? ■

НАТАТКІ

Нямецкая свабода беларускімі вачамі

ЮЛІЯ ДРАНЧУК

Мы працягваем друкаваць германскія нататкі нашага аўтара.

ПРОЦЬМА ШЧЫРАСЬЦІ І САЎКУ

У Гановэры, сталіцы зямлі Ніжняя Саксонія, жыве 60 тысячаў эмігрантаў з СНД. Часьцей за ўсё эмігруюць па дзьвюх лініях – ці ў якасьці рускага немца, высланага ў 30-х у Казахстан, ці па габрэйскай. Так Нямеччына старанна замольвае грахі Гітлера і ягоных паплечнікаў.

А 10-й вечара на вуліцах Гановэру практычна не чуваць нямецкай мовы – паўсюдная расейская. З агромністай колькасьцю мату ў моладзі і пэрманэнтным абмеркаваньнем Пуціна і іншых фігураў расейскай палітыкі – у старэйшых.

Уласна кажучы, нават калі б яны й маўчалі, пазнаць іх вельмі лёгка.

Такое ўражаньне, што ўсю вопратку гэтыя людзі прывезьлі з сабой. Праўда, за «саўком» неабавязкова езьдзіць дахаты. Крамы з назвамі *«Сельпо»*, *«Продмаг»*, *«Гастроном»* кажуць самі за сябе.

«ПРОДМАГ №1»

Адчыняю дзьвery... Савецкая крама шэраговай вёскі – дзьве лядоўні гэткага ж савецкага ўзору – з нахілам, такія й зараз раз-пораз трапляюцца. У лядоўні – кілбасы, рыба, сушоныя кальмары, усе магчымыя й немагчымыя «фішкі да піва», якіх процьма ў беларускіх, украінскіх, расейскіх шапіках. Рыбка ды мяса, прыгатаваныя на ўсялякі густ, раскладзеныя паводле савецкіх канонаў аздабленьня вітрынаў. Гэта цяжка вытлумачыць па нейкіх правілах, але на кантрасьце з афармленьнем нямецкіх крамаў гэтыя адрозьненні відавочныя й катэгарычныя.

У адмысловай лядоўні – піва. *«Балтика»*, *«Арсенальное»*, *«Тверское»*. На паліцах – чэрствыя пернікі (маркую, што наўмысна, каб падкрэсьліць саўковы водар), сгушчанае малако, сушкі, сухары, грачыха (яе немагчыма знайсьці ні ў водным нямецкім супэрмаркеце, там папросту ня ведаюць, што гэта такое), іншыя крупы – іх нялёгка знайсьці ў продажы.

Гандлярка адсутнічае, хаця нашую прысутнасьць гучна засьведчылі адмысловы званочак на дзьвярох. Нарэшце зʼяўляецца. І ўся ейная пастава завершыла зусім родную карціну сапраўднага *«Продмага»*: адчуваньне за яго сьценамі драўляных хатак, бабулек з торбамі і мужчын у ватоўках і гумавых ботах – вяскоўцаў, якія ня маюць куды сыпаццаца. Гандлярка была савецкая. Выраз твару маладой яшчэ дзяўчыны ня меў аніводнага намёку на ветлівую ўсьмешку, уласьцівую ня нямецкім калегам. Адзінае, што розьніла яе ад айчынных прадстаўнікоў гандлю – відавочнае злоўжываньне салярыем. Такое, вы ж разумееце, дазволіць сабе могуць толькі супрацоўніцы нашых буцікаў – і то ня кожная. Уласна кажучы, і шкодна беларусам.

Макіяж гандляркі быў відавочна «наш». Наагул, вялікая частка жанчын-сярод эмігрантак за 35 фарбуецца яркімі цэнамі для павек (асабліва прыцягальныя сінія), у дадатак да іх чырвонай ці буйна-ружовай памадай, мае савецкага ўзору «хімію» і непераданальна «наш» стыль апранацца. І яшчэ адна яскравая рыса: «русачкі» – гэтак называюць самі сябе выхадцы з Савецкага Саюзу – калі сядаюць у транспарце ці папросту на лаву, узьдымаюць ззаду паліто, спадніцу (каб вопратка не выцягвалася, добра выглядала) і тады сядаюць.

Зь якой мэтай гэтыя людзі зьязджаюць ад роднай хаты, ад месцаў, дзе іхныя манэры апранаца лічацца нармалёвымі й прыстойнымі? Па што яны едуць у краіну, дзе ня так лёгка захаваць гэтае імкненьне да «саўку» пасярод махровага капіталізму, абсалютнага унісэксу і ненавязьлівага стылю?

Гэтыя пытаньні ў мяне мацнелі пасьля кожнай новай сустрэчы з колішнімі «нашымі».

ТУРБЮРО

Гартаючы расейскамоўную газэту *«Районка»* (вось яна, сапраўдная настальгія па «саўку»), мая каляжанка з Кіргізіі натрапіла на рэклямную абвестку турыстычнай фірмы, якая абяцала самыя танныя аўтобусныя квіткі да Бішкеку.

Мы не былі пэўныя, што гэта менавіта «руская» фірма, калі ішлі туды на выведку. Але першага ж візыту аказалася дастаткова.

У раскладзе на дзьвярох на чыстай нямецкай мове было дакладна пазначана: «субота, з 9 да 14». На маім гадзінніку была акурат палова на другую. Дзьверы былі безнадзейна зачыненыя, а бязлюдны офіс за шклом не пакідаў сумневаў, што да панядзелку адчыняцца аніяк не мае.

У панядзелак мы прыйшлі зноўку. Нам наватветліва ўсьміхнуліся супрацоўніцы й супрацоўнікі, мы спраўдзіліся, што фірма сапраўды эмігранцкая, і тут пачалося самае цікавае.

Мы селі побач з адной супрацоўніцай. Першая пра квіткі на Менск запыталася я. Жанчына пачала ставіць звыклыя ў гэтых выпадках пытаньні: колькі гадоў, ці ў адзін бок, ці назад таксама, і нарэшце запыталася: «2 квіткі?» – маючы на ўвазе, што мы абедзьве едзем да Менску.

– Адзін, – адказала я.

Жанчына запытальна паглядзела на Гульнару, што была побач.

– А я хацела пацікавіцца коштамі аўтобусу да Кіргізіі, – патлумачыла дзяўчына.

У адказ супрацоўніца турбюро папросту вылупіла вочы, насунулася на нас праз стол. Мусіць, каб лепей ды бліжэй разглядзець гэтую дзівачку. З жахам выдахнула:

– На автобусе? До Киргизии? Милочка, а Вы живая-то доедете? Там ведь неделю ехать!!! Я сегодня только из Испании приехала, – это сутки в автобусе. Но даже и сутки это очень тяжело. И потом... Вам ведь для Польши транзитную визу нужно делать. Для всех стран СНГ у них визы недавно ввели, поэтому Вас поляки либо

Заканчэньне на стар. 6 ➲

АНОНС

2 апреля в КЗ «Минск» агентство «Альфа-концерт» представляет спектакль знаменитого Романа Виктюка «Элеонора» по пьесе Гиго де Клера о последнем дне Элеоноры Дузе.

Это спектакль о жизни и смерти великой актрисы, а между ними – искусство. Мы увидим ожившие воспоминания, где реальность переплетается со сценами из спектаклей, а любимые люди – с партнерами и персонажами. На главные роли Виктюк пригласил удивительную российскую актрису Ирину Соколову и солиста балета Мариинского театра Владимира Аджамова. Насыщенная мыслями и чувствами постановка обещает порадовать нас зрелищностью и пластикой.

НАВІНЫ СНД

Грузія. У ноч зь нядзелі на панядзелак у Тбілісі адбылося збройнае паўстаньне, якое, аднак, дзякуючы своечасовым мерам удалося спыніць. Уначы ў нядзелю група ветэранаў Нацыянальнай гвардыі ў колькасьці каля 50 чалавек пранікла на тэрыторыю адной з збройных частак, што знаходзіцца ў густанаселеным раёне Тбілісі, захапіла і завяла тры танкі і зрабіла спробу вывесьці іх на вуліцы гораду. Раней таксама паведамлялася, што група захапіла адміністрацыйны будынак часткі і паабяцала яго ўзарваць у выпадку штурму. Паўстанцы сьцьвярджалі, што гэткім чынам пратэстуюць супраць прыняцьця закону, які нібыта парушае правы ветэранаў збройных сілаў. Паўстанцы ў хуткім часе былі абкружаныя сьпецназам міністэрства абароны і пасьля доўгіх перамоваў з раніцы ў панядзелак згадзіліся здацца. Усе яны былі арыштаваныя і дастаўленыя ў паліцыю, якая праводзіць сьледзтва.

Цікава, што аналягічнае паўстаньне ў гэтай жа вайсковай частцы здарылася каля палутара год таму. Сьледзтва падазрае, што за акцыяй стаіць былы міністар абароны Тэнгіз Кітавані, які стаяў на чале міністэрства ў 1991–1993 гадах, а зараз жыве ў Маскве і займаецца актыўнай палітыкай, зьяўляючыся праціўнікам прэзыдэнта Шэварднадзэ.

Як паведамілі грузінскія сьпецслужбы, ім было вядома пра падрыхтоўку паўстаньня, аднак яны ня мелі інфармацыі пра тое, у якой канкрэтна частцы адбудзецца выступленьне.

Беларусь. Амбасадар Іраку ў Беларусі Салман Зэйдан паведаміў журналістам, што ў амбасаду паступілі ўжо мільёны лістоў беларусаў, якія выказваюць падтрымку рэжыму Хусэйна і гатовыя змагацца за яго са зброяй у руках. Па ягоных словах, паступалі звароты нават ад жанчынаў, якія жадаць аказваць медычную дапамогу іракцкім жаўнерам на поле бою. Зэйдан таксама дадаў, што «*іракская армія, якая мае вялікі баявы досьвед, будзе абараняць сваю краіну да канца*», а ЗША і Вялікабрытанія атрымаюць зь Іраку *«тысячы трунаў з ь целамі агрэсараў»*. Відаць, толькі прыродная сьціпласьць не дазволіла спадару Зэйдану сказаць пра мільярды беларусаў, што падтрымліваюць Ірак, і пра мільёны трунаў зь целамі агрэсараў.

Грузія. На мінулым тыдні прэзыдэнт Грузіі Эдуард Шэварднадзэ выступіў адразу зь некалькімі заявамі наконт вайны ў Іраку. Ён сказаў, што Рада бясьпекі ААН проста ня здольная прымаць дзейсныя рашэньні пры ўзьнікненьні крызысных сытуацыяў. «*Грузія выпрабавала гэта на сабе, калі ніводная з 28 рэзалюцыяў Рады бясьпекі па Абхазіі не была выкананая,*» – сказаў спадар Шэварднадзэ.

Грузія таксама згодная даць дазвол кааліцыі на выкарыстанне сваёй паветранай прасторы і вайсковых базаў дзеля вядзеньня баявых дзеяньняў супраць Іраку. Шэварднадзэ падкрэсьліў, што «*Грузія актыўна падтрымлівае палітыку ЗША у адносінах да Іраку*». Паводле ягоных словаў, «*пакуль у Садама Хусэйна ёсьць зброя масавага зьнішчэньня: атамная, хімічная, бактэрыялягічная – мір ня можа жыць спакойна*». Шэварднадзэ таксама прыгадаў, што пачынаючы з 1992 года фінансавая дапамога ЗША Грузіі склала 1,2 мільярда даляраў, ня лічачы гуманітарнай дапамогі. Акрамя таго, ЗША штогод выдаткоўваюць 70 мільёнаў даляраў дзеля падрыхтоўкі грузінскай арміі. «*Хачу, каб у Амэрыцы ведалі – грузіны ўмеюць быць удзячнымі,*» – дадаў грузінскі лідар.

Чачня. Паводле папярэдніх дадзеных, за прыняцьце новай чачэнскай канстытуцыі і за законы пра выбары прэзыдэнта і парляманта выказаліся каля 95 адстокаў выбаршчыкаў, што прынялі ўдзел у рэфэрэндуме. Яўка на выбарчыя ўчасткі склала больш за 80 адсоткаў. Назіральнікі ад СНД адзначаюць, што рэферэндум у цэлым адпавядаў дэмакратычным нормам. Прыняцьце новай канстытуцыі, якая прызнае Чачню часткай Расеі, дазваляе правесьці выбары новага прэзыдэнта і парляманту рэспублікі. Паводле расейскіх крыніцаў, выбары могуць прайсьці ўжо ў гэтым годзе, магчыма, што адначасова з выбарамі ў Дзярждуму 14 сьнежня.

Да 1992 года ў Чачні дзейнічала канстытуцыя 1977 года, якая адпавядала канстытуцыям СССР і РСФСР. Джахар Дудаеў ініцыяваў прыняцьце новай канстытуцыі, якая абвяшчала Чачню незалежнай суверэннай дзяржавай. Пасьля прыходу да ўлады прзыдэнта Масхадава ў Чачні канстытуцыя была адмененая і ўведзеныя законы шарыяту, якія мелі прамое дзеяньне ў рэспубліцы.

С ДРУГОГО БЕРЕГА

Война и мир

Окончание. Начало на стр. 1

Рациональному европейскому наблюдателю Ирак представляется скорее привычной диктатурой прошлого, чем призраком глобального терроризма будущего. Однако психологией американцев двигал элемент не рациональный, а новый, подсознательный, привнесенный в мировую политику постсентябрьской национальной травмой.

В тот день, всего несколько часов после трагедии, на фоне клубящегося над Нижним Манхэттеном дыма, сразу несколько комментаторов поставили на Си Эн Эн вопрос: «Каким образом Америке бороться против новой страшной угрозы?»

Логичный ответ не заставил себя долго ждать – путем борьбы с террористами и государствами-спонсорами террористов. Большинство американцев плохо разбираются в тонкостях Ближнего Востока. Для них Саддам Хусейн и Осама бен Ладен – если не одно и то же, то, как гласит народная поговорка, «чертовски близко».

Один социологический опрос пару месяцев назад вообще показал, что едва не половина опрошенных американцев напрямую связывают события 11 сентября с Саддамом.

Для любимой республиканскими философами доктрины превентивного действия против стран-террористов возникла плодородная почва. Именно вокруг этой идеи, как самой надежной опоры своей политики в общественном мнении, и построил свое военное обращение к нации президент Буш.

Не только состояние травмы, но и сама новизна присутствия в мире испепеляющей ненависти к ним ставят американцев перед необходимостью непривычных решений. Нация еще не вполне знает, как формировать политические взгляды в этих новых условиях досягаемости для вражеских налетов.

Сеть общественных радиостанций провела серию бесед с людьми в нескольких штатах. Ответ сотен радиослушателей был удивительно прост: «*Мы в точности не знаем, что происходит, но мы доверяем президенту, потому что у него больше информации и он знает, что делает*». Так общественное мнение сняло с президента бремя доказательств конкретных связей Саддама с террористами или разработок ядерного оружия, а с себя – ответственность за их независимый поиск.



Белорусскому читателю, наблюдавшему процесс становления нового политического менталитета у себя в стране, такое поведение электората должно показаться знакомым. Испытывает электорат и трудности с отделением гражданства от позиции в отношении политики правительства. «*У меня большие сомнения в правильности действий без мандата ООН. Но я – гражданин США и потому я буду морально поддерживать действия своей армии*», – сказал коллега вашего корреспондента.

Более существенный вопрос – в общем определении патриотизма. Также знакомым любому белорусскому оппозиционеру приемом, администрация Буша постоянно громит любую, даже самую конструктивную, оппозицию своему курсу как непатриотическую или, хуже, антиамериканскую. После одиннадцатого сентября, когда травмированное массовое сознание во многом поддерживается идеей патриотизма, связанной с имиджем Буша, такие приемы часто имеют эффект.

Усиленные отсылки к понятию «патриотизм» озарили весь период после 9/11, приклеив даже название «Акт американского патриота» к одобренному конгрессом закону, сильно расширившему полномочия спецслужб по поиску и судебному использованию. Этот закон стал самым неоднозначным внутренним последствием теракта и подвергается жесткой критике приверженцев гражданских прав.

Однако за семьюдесятью процентами сторонников войны не приходится видеть признаки массового воинственного духа, охватившего европейские нации в 1914 году или самих американцев, на Юге и на Севере, в 1861-м. Поддержка имеет пассивный характер и происходит от неуверенности больше, чем от убеждения в правильном пути. Те же респонденты, что доверяют президенту Бушу, высказали сомнения в долгосрочных последствиях курса.

Сосредоточение внимания администрации Белого дома на Ираке вызывает сомнение в сравнении с угрозой, исходящей от Северной Кореи, но с которой никто пока не собирается воевать. Остаются Сомали, Иран, Ливия, Зимбабве и другие сомнительные режимы, и многие американцы задают вопрос, придется ли их сыновьям в военной форме сражаться и в этих странах. «*Что заставляет нас думать,* – спросила одна радиослушательница, – *будто у нас есть лучший в мире ответ на все стоящие перед миром проблемы?*»

Среди сторонников и противников войны играет важную роль и сама смена обстоятельств. Одно дело – быть «за» или «против» в принципе, совсем другое – когда твоя страна уже вовлечена в военный конфликт.

Социологи Гэллапа, проводившие последний опрос, среагировали на эту перемену тонкой вариацией в вопросе: вместо «*поддержки идеи применения военной силы в Ираке*», они использовали «*поддерживаете ли вы действия президента*».

Гражданская солидарность с властью и армией в бою знакома всем народам. По всем признакам, для большинства населения поддержка имеет пассивный характер и смешана с неуверенностью, опасениями за жизнь родных в армии и страхом перед возможными террористическими актами.

Не затмила национальная безопасность и экономических проблем. Оптимизм сменился готовностью к худшему. Внушавшие надежду показатели оказались временными, и экономика по всем признакам снова входит в рецессию. Сотни тысяч уже остались без работы, не перестают поступать новости о закрывающихся предприятиях, рынки ценных бумаг ставят под вопрос обеспеченность пенсий. Проблемы в системе обеспечения здоровья, особенно пожилого населения, все больше выходят на поверхность.

Не наблюдается и видимых признаков уличного ура-патриотизма. После 11 сентября подъем национальной солидарности был всеобщим: лозунги на неоновых вывесках на пригородных шоссе, дома и машины при флагах, передовые в газетах, собрания на предприятиях, молебны в церквях. Ничего этого сегодня нет, и даже в случайных разговорах люди как будто бы избегают темы Ирака, так как не вполне уверены в том, в каком ключе о ней говорить.

Незыблемый ландшафт нации, разделившейся 50 на 50, не стереть даже мощными бомбами. Несмотря на общий высокий рейтинг, среди сторонников демократов рейтинг Буша намного ниже среднего для президентов противоположной партии.

Либерально-розовые американцы давно и явно ненавидят эпоху Рейгана. Те, кто гордо именует себя его последователями, вселяют в демократическую публику еще более сильные чувства.

Напротив, консервативный Юг, откуда происходит больше половины армии, со слезами на глазах отправляет в дорогу солдат. Но подлинно воинственный дух наблюдается среди противников войны – стотысячные акции, по численности превосходящие всю армию Ирака, прошли во всех крупных города Америки в считанные часы после начала военных действий.

Журнал «Ньюсуик» вышел на этой неделе под обложкой, на которой изображена падающая точная бомба с заголовком «Почему Америка пугает мир? И что нам с этим делать». Автор материала Фарид Закария, живущий в США арабско-индийского происхождения социолог, известен своими трезвыми и не всегда утешительными взглядами на американскую политическую систему.

Тот факт, что такой громкий заголовок и такой вдумчивый, далекий от свойственной американской прессе поверхностной сенсационности материал появился в одном из самых читаемых журналов, вселяет надежду. Когда-нибудь затянувшийся шок от падения небоскребов все-таки пройдет. Нервный рефлекс испуганного патриотизма уступит место в массовом сознании трезвому анализу роли в мире Америки, от этого мира вовсе не защищенной. ■

ВАЙСКОВЫЯ ХРОНІКІ

20 сакавіка. Праз паўтары гадзіны пасьля заканчэньне дзеяньня ўльтыматуму кааліцыйная авіяцыя пачала наносіць ракетна-бомбавыя ўдары па ўсіх найбуйнейшых гарадах Іраку, бамбаваньне працягваліся ўвесь дзень. Пад удары ў Багдадзе патрапілі палацы і бункеры лідараў краіны, а таксама асяродкі камандаваньня. Паступіла інфармацыя пра тое, што сярод вышэйшага кіраўніцтва краіны ёсьць страты. Паведамлялася, што, магчыма, загінуў малодшы сын Садама Кусай Хусэйн. З раніцы Садам Хусэйн выступіў па нацыянальным тэлебачаньні і заклікаў іракцаў абвесьціць джыхад агрэсарам. Пад вечар пачалі паступаць паведамленьні пра тое, што сухапутныя сілы кааліцыі ўкрочылі на тэрыторыю Іраку на поўдні.

21 сакавіка. Ірак спрабаваў абстраляць Кувэйт ракетамі «Скад». Характэрна, што на працягу апошніх некалькіх год Садам пераконваў міжнародных інспэктараў, што ў яго няма ракет, якія здольныя несьці хімічныя зарады. З раніцы паступіла афіцыйнае паведамленьне, што саюзныя калёны ўкрочылі на тэрыторыю Іраку і распачалі наступ на Багдад з трох накірункаў: з поўначы, з захаду і з поўдня. На сваім шляху яны не сустрэлі сыстэматычнай абароны, а толькі асобныя вузлы супраціву. Не апраўдаліся, аднак, спадзяваньні пра масавыя здачы іракскіх жаўнераў у палон. Цяжкія баі з самай раніцы распачаліся за порт Умм-Каср. Пад абед саюзьнікі падышлі да другога па велічыні гораду Іраку Басры, аднак у яго прыгарадах таксама сустрэлі жорсткі супраціў. Перадавыя атрады саюзьнікаў да канца дня прасунуліся на 150 кілямэтраў углыб тэрыторыі Іраку і вымушаныя былі спыніцца дзеля таго, каб падцягнуць тылы. Увесь дзень авіяцыя працягвала наносіць бомбавыя ўдары па ўсёй тэрыторыі Іраку. На поўдні Іраку гараць некалькі нафтавых свідравінаў. Саюзьнікі за два дні згубілі забітымі каля 20 чалавек (12 брытанцаў, 4 амэрыканцаў і 4 жаўнераў Аб'яднаных арабскіх эміратаў).

22 сакавіка. Турэцкія войскі ўкрочылі на поўнач Іраку і зьбіраюцца стварыць «буфэрную» зону на яго тэрыторыі, каб пазьбегнуць вылазак курдзкіх баевікоў у Турцыю. На працягу дня працягваліся зацятыя баі ў гарадах Басра і Умм-Каср. Саюзьнікі некалькі разоў паведамлялі пра захоп гэтых гарадоў, але пасьля абвяргалі папярэднюю інфармацыю. Паступілі звесткі пра ўзяцьце яшчэ некалькіх іракскіх гарадоў практычна бяз бою. У палон саюзьнікам здаўся камандуючы 51-й дывізіяй Іраку, а сама дывізія практычна спыніла супраціў. За дзень саюзьнікі згубілі яшчэ 11 забітых жаўнераў (5 амэрыканцаў і 6 брытанцаў).

23 сакавіка. Адзін з амэрыканскіх жаўнераў зьдзейсьніў тэрарыстычны акт на вайсковай базе «Пэнсыльванія» ў Кувэйце. Ёсьць забітыя і параненыя. 4-я дывізія, якая знаходзілася на караблях каля ўзьбярэжжа Турцыі, атрымала загад рухацца ў бок Кувэйту пасьля таго, як турэцкі парлямант у чарговы раз ня даў згоды на выкарыстаньне тэрыторыі краіны для баявых дзеяньняў саюзьнікаў супраць Іраку. Па дадзеных саюзнага камандаваньня, у палон здаліся ад 1 да 2 тысячаў іракскіх жаўнераў. Іракская СПА зьбіла адзін амэрыканскі і адзін брытанскі самалёт над Багдадам. Сьпецслужбы шукаюць пілотаў, якім удалося катапультавацца. Кааліцыя вядзе баі каля гораду Эн-Насірыя. Ёсьць забітыя, параненыя і зьніклыя бязь вестак. За дзень амэрыканскія войскі згубілі 5 чалавек забітымі, 14 параненымі і 12 зьніклі бязь вестак.

24 сакавіка. Амэрыканцы паведамілі, што яны знайшлі завод па вытворчасьці хімічнай зброі ў 160 кілямэтрах на поўдзень ад Багдаду. 3-я пяхотная дывізія ЗША здолела падысьці на 80 кіламэтраў да іракскай сталіцы. Аднак саюзьнікі пакуль ня ўзялі ключавы горад Эн-Насірыя, у якім знаходзіцца стратэгічны мост праз Эўфрат, па якім войскі павінныя працягваць наступ на Багдад. Амэрыканцам удалося перакінуць частку сваіх войскаў на тэрыторыю іракскага Курдыстану праз паветраную прастору Турцыі. Там падразьдзяленьні арміі ЗША разварочваюць паўночны фронт. За дзень войскі кааліцыі ў баях згубілі 1 чалавека забітым і 3 патрапілі ў палон.

25 сакавіка. Кааліцыя сьцягвае войскі на лінію фронту ў 50 кілямэтрах на поўдзень ад сталіцы. Назіральнікі адзначаюць, што бітва за Багдад пачнецца ў самы бліжэйшы час. На поўначы саюзьнікі рыхтуюцца да таго, каб адрэзаць стратэгічна важны горад Масул ад рэшты краіны і ўзяць яго ў кола блякады. Мінныя тральшчыкі расчышчаюць акваторыю порту Ум-Каср, які будзе ўжывацца дзеля дастаўкі гуманітарнай дапамогі ў Ірак. Гэта можа сьведчыць пра тое, што горад і порт кантралююцца войскамі кааліцыі. Кааліцыйныя войскі ўзялі ў палон 3 500 жаўнераў арміі Іраку. За дзень кааліцыя згубіла аднаго забітага брытанскага сьпецназаўца.

26 сакавіка. Паступілі паведамленьні пра буйную бітву пад Кербалай і Наджафам на поўдзень ад Багдаду, у ходзе якой кааліцыйныя войскі нанесьлі паразу іракцкаму войску. Паводле тэлеканалаў, Ірак згубіў забітымі ад 300 да 500 жаўнераў. Незразумела толькі, ці гэта былі жаўнеры рэгулярных войскаў, ці апалчэньня. У Басры, па некаторых дадзеных, паўстала насельніцтва. Саюзныя войскі чакаюць узыходу сонца дзеля таго, каб праверыць гэтыя зьвесткі. Брытанскія войскі згубілі яшчэ двух жаўнераў, калі два брытанскіх танкі праз памылку абстралялі адзін аднаго.

ПАДРАБЯЗНАСЬЦІ

Выбраныя старонкі гісторыі Іраку

АЛЯКСЕЙ ГРЫНЕВІЧ

Сёньня шматлікія крытыкі ЗША і Ангельшчыны, якія выступаюць супраць праліцьця крыві нявінных людзей у Іраку, кажуць пра значныя страты сярод мірных жыхароў. Аднак гэта краіна нясе вялізныя страты ў людзях прынамсі на працягу апошніх 30 год, пакуль пры ўладзе знаходзяцца партыя БААС і Садам Хусэйн.

Партыя БААС прыйшла да ўлады ў Іраку ў 1968 годзе. Яе ідэалёгія – гэта цяжкая сумесь арабскага нацыяналізму і сацыялістычных ідэяў. У свой час гэтая партыя правіла таксама ў Егіпце і Сірыі, а яе аддзяленьні існуюць практычна ва ўсіх арабскіх краінах. У Іраку яна прыйшла да ўлады ў выніку збройнага паўстаньня. Наступнае паўстаньне адбылося ў 1979 годзе, калі Садам Хусэйн скінуў сваіх былых партыйных сяброў і абвесьціў сябе лідарам рэгіянальнага аддзяленьня партыі і прэзыдэнтам Іраку. Усе годы знаходжаньня партыі пры ўладзе – гэта гісторыя канфліктаў на рэлігійнай і міжэтнічнай глебе ў Іраку.

Справа ў тым, што Ірак – гэта вельмі складаны кангляմэрат народнасьцяў і веравызнаньняў. Паводле афіцыйнай статыстыкі, тут 75 адсоткаў насельніцтва складаюць іракцы. Але такой нацыянальнасьці не існуе: іракцы складаюцца з арабаў, асырыйцаў, пэрсаў, туркменаў ды іншых старажытных і ня надта народаў, якія ў розныя пэрыяды гісторыі прыходзілі ў Месапатамію і заставаліся ў ёй. Яшчэ 20 адсоткаў насельніцтва складаюць курды.

Па веравызнаньню насельніцтва Іраку на 95 адсоткаў мусульманскае, а астатнія пяць адсоткаў у асноўным хрысьціяне такіх экзатычных плыняў, як нестарыяне, халдзеі ці рыгарыяне. Аднак мусульманскае насельніцтва краіны таксама неаднароднае. Тут праходзіць гістарычная мяжа паміж дзьвюма вялікімі плынямі ісламу – сунітамі і шыітамі.

Партыя БААС – у асноўным суніцкая партыя. І таму практычна адразу пасьля яе прыходу да ўлады ўзьніклі праблемы ва ўзаемаадносінах з шыітамі, якія жывуць у асноўным на поўдні краіны, у багнах пры ўпадзеньні Тыгру і Эўфрату ў Пэрсідзкую затоку ў аколіцах гораду Басры. За шыітамі стаяў магутны Іран, зь якім да ўсяго яшчэ ў Іраку былі тэрытарыяльныя спрэчкі, што выліліся ў крывавы збройны канфлікт 1980-1988 гадоў, пад час якога Хусэйн ужываў супраць сваіх праціўнікаў хімічную зброю. Адначасова багдадзкі рэжым праводзіў сыстэматычны генацыд шыіцкага насельніцтва паўднёвага Іраку, што ня скончыўся нават пасьля падпісаньня мірнай дамовы зь Іранам. Супраць жыхароў багнаў ужываліся баявыя самалёты і хімічная зброя. Іх практычна «выкурвалі» з багны, якую затым асушаліся. Гэта ўжо зараз прывяло да экалягічнай катастрофы – зьнікненьня ўнікальнага рэгіёну плянэты з шматлікімі рэдкімі гатункамі флёры і фаўны. Людзей жа, якія жылі там, сілай перасялялі ў гарады, дзе тайная паліцыя Садама мела б магчымасьць за імі шчыльна назіраць. Пасьля адной з чарговых атакаў на мірнае насельніцтва ў 1993 годзе ЗША і саюзьнікі забаранілі палёты іракскай авіяцыі ў паўднёвых і паўночных раёнах краіны, каб хаця б нейкім чынам абараніць мірнае насельніцтва ад атакаў з боку збройных сілаў. Цяжка ацаніць страты сярод людзей за ўвесь пэрыяд канфлікту, аднак крыніцы ў ААН гавораць пра дзясяткі тысячаў забітых і сотні тысячаў, калі не мільёны, бежанцаў у іракскія гарады і ў суседні Іран.

Нельга, аднак, сказаць, каб іракскія шыіты былі зусім ужо мірнымі. Яны дастаткова нацярпеліся ад Багдаду і імкнуцца да аб'яднаньня з роднасным ім Іранам. Гэты фактар не дадае аптымізму шматлікім скептыкам будучыні Іраку. Яны лічаць, што паўднёвыя шыіты – гэта адзін з фактараў распаду адзінай іракскай дзяржавы пасьля вайны. Другі фактар – гэта курды, якія жывуць на поўначы краіны.

Курды – вельмі старажытны народ, якому, аднак, на працягу ўсёй яго гісторыі ня шчасьціла. Так сталася, што яны заўсёды жылі на стыку дзьвюх ці некалькіх імпэрыяў (Рымскай, Пэрсідзкай, Візантыйскай, Асманскай, Арабскага халіфату, Ірану). Акрамя таго, курдам увесь час даводзілася весьці войны супраць захопнікаў, якія прыходзілі на іх землі, а іх было нямала (арабы, туркі, манголы, туркмены, пэрсы ды інш.).

У нашыя дні курды – гэта найбольшая нацыя, якая ня мае ўласнай дзяржаўнасьці. Яны жывуць на тэрыторыі чатырох краінаў, кожная зь якіх спрабуе па-свойму змагацца з імкненьнем курдаў да незалежнасьці (Турцыя, Ірак, Іран, Сірыя). Часам гэтае змаганьне пераўтвараецца ў збройныя канфлікты, як гэта было ў Турцыі ці Іраку.

У 1970 годзе ў Багдадзе зразумелі беспэрспэктыўнасьць збройнага змаганьня з курдамі і падпісалі зь імі так званы «сакавіцкі маніфэст» пра стварэньне курдзкай аўтаноміі. Аднак практычна адразу пасьля гэтага войскі Іраку правялі масавыя этнічныя чысткі ў раёнах, якія прылягалі да Курдыстану, аднак не ўвайшлі ў яго. Мэтаю гэтых чыстак было дабіцца адсяленьня курдаў і зьмяніць этнічны склад гэтых тэрыторыяў. А ў наступным 1971 годзе каля 40 тысячаў курдаў-шыітаў былі дэпартаваныя ў Іран.

У 1975 годзе Ірак дамовіўся зь Іранам, што за пэўныя тэрытарыяльныя саступкі той ня будзе дапамагаць курдзкім паўстанцам. Аднак у 1979 годзе ў Іране адбылася рэвалюцыя, а ў наступным годзе курды пры дапамозе Ірану зноў узьнялі паўстаньне. Канфлікт працягваўся больш за 8 год і быў вельмі крывавым. Хусэйн ужываў супраць паўстанцаў у тым ліку хімічную зброю. Дакладна вядома, што такі выпадак меў месца ў 1988 годзе ў горадзе Халабія. Тады ў выніку атакі іпрытам загінула 5 тысячаў жыхароў гэтага гораду, а яшчэ 10 тысячаў атрымалі цяжкія атручваньні. Курды сьцьвярджаюць, што гэта не адзіны выпадак ужываньня зброі масавага зьнішчэньня супраць іх.

У 1991 годзе, пасьля кувэйцкай вайны, курды, карыстаючыся слабасьцю Хусэйна, узьнялі паўстаньне і фактычна аддзялілі тры паўночныя правінцыі ад Іраку. У адказ на іх рушылі танкі і паляцелі бомбы з самалётаў. Кажуць, што зноў ужываліся баявыя газы. Аднак пасьля ўвядзеньня забароны на палёты іракскай авіяцыі ў паўночных і паўднёвых раёнах краіны сытуацыя стабілізавалася. Зараз у паўночных раёнах Іраку дзейнічае нікім не прызнаная курдзкая дзяржава, якая, аднак, разьдзіраецца ўнутранымі спрэчкамі за ўладу і кантроль над нафтай.

Калі казаць пра амэрыканскія прэтэнзіі да іракскага дыктатара, то трэба прызнаць, што яны шмат у чым маюць пад сабой падставы: Хусэйн сапраўды зьяўляецца адным з найбольш крывавых дыктатараў у гісторыі, які зьнішчаў насельніцтва ўласнай краіны, ужываючы дзеля гэтага ў тым ліку хімічную і, па асобных зьвестках, бактэрыялягічную зброю. Аднак пасьля перамогі саюзнай кааліцыі ЗША і Ангельшчыне дастанецца цяжкі клубок праблемаў, якія іракскі дыктатар спрабаваў вырашыць сілай. Калі не знайсьці з гэтых праблемаў выйсьця, то Ірак проста спыніць сваё існаваньне як адзіная дзяржава. ■

ПО СТРАНАМ И КОНТИНЕНТАМ

Израиль. Военные действия в Ираке привели к первым цензурным ограничениям в Израиле. Так, руководительница цензурного комитета вооруженных сил Израиля Рахиль Долев направил двум новостным веб-сайтам, *Rotter* и *Fresh*, письма с рекомендацией прекратить публикацию критической информации и приказом перед публикацией таких материалов консультироваться с цензурными властями Иерусалима или Тель-Авива. Оба письма были переведены и опубликованы Федерацией американских ученых. Суть ограничений сводится к нескольким моментам: в случае ракетных ударов сайты не имеют права указывать точное место попадания и тип используемых ракет, также запрещено сообщать об израильских военных операциях, правительственных совещаниях и сотрудничестве Израиля с другими государствами. Согласно мнению организации «Репортеры без границ» (*RSF*), Израиль занял неоднозначную позицию по отношению к свободе печати. Эта организация ставит Израиль на 92 место в своем отчете о ситуации со свободой печати в мире. В целом, свобода слова в Израиле соблюдается, однако *RSF* осуждает методы, применяемые на оккупированных территориях, где журналистов запугивают и запрещают посещать места боевых действий.

Шри-Ланка. На минувшей неделе в Шри-Ланке, правительство которой ведет мирные переговоры с тамильскими сепаратистами, разгорелся нешуточный скандал. Выяснилось, что диалог, начатый представителями террористической организации «Тигры освобождения Тамил Илама», – не более чем попытка выиграть время и перегруппировать свои силы. В то время как одни «тигры» вели переговоры о полном прекращении огня и восстановлении мира в Шри-Ланке, другие занимались поисками оружия для своей организации. Коварство цейлонских «тигров» было раскрыто российскими представителями «Рособоронэкспорта» в Лаосе, с которыми террористы вели переговоры о покупке ракет класса «земля-воздух». По словам российского посла в Шри-Ланке Михаила Карпова, как только представителям российской фирмы стало известно о связи их потенциальных клиентов с террористической организацией, переговоры были прекращены, а информация о них была передана властям Шри-Ланки. В начале года, когда правительство только намеревалось начать переговоры с террористами, противники примирения предупреждали, что миролюбие «тигров», скорее всего, неискреннее. Тем не менее власти пошли на диалог и, похоже, не намерены отказываться от него и сейчас.

Зимбабве. Не успели американцы уничтожить Саддама, как принялись за другого диктатора. Администрация Буша выпустила исполнительный указ, угрожающий экономическими санкциями против президента Зимбабве Роберта Мугабе и 76 официальных лиц, представляющих его правительство. Санкции, которые начались с 7 марта, запрещают любой корпорации США иметь деловые отношения с Зимбабве, а также замораживают любые вклады, которые могут иметь в банковских учреждениях США эти зимбабвийские руководители. Эта акция США повторяет сходное решение, которое вынес Евросоюз в прошлом году. В заявлении, оправдывающим санкции, президент Джордж Буш отметил, что «*в течение более чем двух лет правительство Зимбабве систематически подрывало демократические институты страны, используя насилие, угрозы и репрессивные методы, включая законодательные, чтобы не допустить оппозицию к власти*». Весь сыр-бор разгорелся из-за того, что в течение последних двух лет Мугабе поддерживал массовые захваты земли, принадлежащей белым фермерам, и передачу ее безземельным черным ветеранам национально-освободительной войны. На практике это представляло откровенный беспредел. Вряд ли Мугабе, которого поддерживает вся Южная Африка, изменит свою позицию. Недавно, выступая на встрече неприсоединившихся стран в Малайзии, лидер Зимбабве потребовал, чтобы США сделали первый шаг в избавлении от своих вооружений массового уничтожения, а не Ирак, а захваты земель он назвал «*исправлением исторической ошибки*».

ГЕОПОЛИТИКА

Кто остановит дождь?

ОЛЕГ ПЕТРОВ

Полузабытый хит «Криденс» *Who Stops the Rain* (Кто остановит дождь), бывший в 70-х годах прошлого века гимном пацифистов, с началом войны в Ираке триумфально вернулся в хит-парады музыкального радио. Спустя сорок лет антивоенные настроения снова становятся повальной модой.

Модный в среде нью-йоркской богемы *Village Voice* радостно сообщает, что американские кутюрье выбросили на рынок первую партию спецодежды для пацифистов. Теперь за пару тысяч баксов борцы за мир могут приобрести джинсовый жупан, расшитый пацифистскими лозунгами, и щеголять по антивоенным акциям как заправские хиппари 60-х.

На самом деле, по своему размаху легендарное антивоенное движение «детей цветов» в подметки не годится нынешним пацифистам. Первые крупные антивоенные акции начались лишь в 1965 году после решения президента Линдона Джонсона разместить в Южном Вьетнаме американские войска. Между тем, война в Индокитае тянулась с середины 40-х. 17 апреля 1965 года пацифисты собрали в Вашингтоне 20 000 человек. Еще два года им понадобилось, чтобы антивоенные протесты приняли международный характер.

Ныне же, благодаря средствам масс-коммуникации, прежде всего интернету, противники англо-американской интервенции в Ираке мобилизируют своих сторонников за считанные часы в самых медвежьих уголках планеты.

Сегодня в рядах противников войны репрезентанты всех социальных групп: президент-рабочий Лула, крестьянин-хулиган Жозе Бове, республиканский сенатор Барбара Ли, профессор Хомски и даже попсовая группа «Тату». Странными именами пестрит лагерь антивоенных протестантов. Очень разные и порой весьма сомнительные мотивы приводят людей в состав бойцов за мир.

Наиболее экзотично в этом движении выглядят лидеры авторитарных государств, вроде белорусского батьки. В авторитарных странах пацифизм поставлен на самую широкую ногу. В Северной Корее объявлена круглосуточная вахта мира на центральной площади Пхеньяна, в Беларуси участников антивоенного митинга мобилизируют за счет разнарядок на военные кафедры, в Малайзии по приказу правительства 450 общественных организаций сколотили официальное движение «Малайзия за мир». Оппозиционеров, которые тоже было навострились бороться за мир, в состав вышеупомянутой организации не пустили.

Второй блок антивоенного лагеря составляют Европа и Россия в форме оси Москва – Берлин – Париж. У европейцев и русских имеется целый комплекс причин фрондировать против Вашингтона. Здесь у них и собственная политическая культура, и традиции решения внешнеполитических проблем, и продемонстрированное Вашингтоном явное пренебрежение нормами международного права.

При этом, как правило, в тени остается экономические и политические интересы новоявленного тройственного согласия на Ближнем Востоке. Последнее весьма немаловажно при определении позиции к кампании США в Ираке.

Джеймс Бакер из Института публичной политики, работающего под крышей вице-президента Чейни, в своем докладе *Strategic Energy Policy for the 21st Century* указывает, что «*до последнего времени русские находились в особых отношениях с Багдадом и всячески тормозили экспортные возможности этой страны. Если санкции, введенные против иракского нефтяного сектора, будут сняты и инфраструктура Ирака улучшится, то цены на нефть упадут, нанеся катастрофический ущерб российской экономике*».

Также можно проследить динамику роста французского импорта в Ирак. Если в 1999 году в Ирак было импортировано товаров на 761 миллион евро, то в 2000 году уже на 1455 миллионов. Конец Саддама означает закрытие иракского рынка для французских компаний.

Немецкие интересы связаны с французскими. Здесь ставка тоже делалась на политику «пряника». Только в первые три месяца 2002 года немецкий импорт в Ираке вырос на 46,6 процента. В основном это были продукты *know how*.

Третья фракция антивоенного движения – неправительственные организации (НПО), которые составляют костяк пацифистов.

Часть из них – организации антиглобалистов, которые первыми начали эксплуатировать пацифистские слоганы. Напомним, что еще в ноябре прошлого года они организовали во Флоренции миллионную демонстрацию. На сайтах таких ведущих антиглобалистских группировок, как *Attas* или *Globalize Resistance*, можно всегда найти актуальную информацию на тему войны. Подвязались на антивоенной тематике «зеленые» и эсдэки.

Другая часть пацифистов возникла спонтанно в рамках гражданских проектов. Из них наиболее известны *Not in our Name*, *Now stop the War and end Racism* (США), *Stop War* (Великобритания).

Исследовать феномен можно на примере истории калифорнийской антивоенной группы *Not in our Name* (не нашим именем). Эта НПО возникла весной прошлого года, когда озабоченный военными приготовлениями Белого дома, рядовой учитель из Лос-Анжелеса опубликовал в местной газете объявление о том, что ищет однодумцев.

Откликнулась дюжина сограждан, постановивших создать группу, чтобы бороться против войны и преследования эмигрантов из арабских стран. В сентябре 2002 года группа собрала пожертвований на сто тысяч долларов и опубликовала на страницах *New York Times* свой плакат. Сто тысяч американцев смогли прочитать набранный большим кеглем текст: «*Президент Буш сказал: вы со мной или вы против меня. Наш ответ – не нашим именем*». Под плакатом была размещена петиция, которую подписали такие властители американских дум, как Оливер Стоун, Курт Воннегут, Джейн Фонда, Терри Гильям...

На следующий день сайт группы посетило 100 000 человек. Сегодня *Not in our Name* объединяет 30 000 активистов. На вопрос журналистов шведской газеты *Ordfront* «*может ли петиционное движение остановить войну?*», лидер группы Джоуи Джонсон отвечает: «*Сегодня нас тысячи. Мы хотим, чтобы завтра нас было миллион*».

Как пишет нью-йоркский *Newsday*, пацифисты делают ставку на то, чтобы всколыхнуть общественность, как в 60-е. Настроения улицы поздно или рано должны будут передаться политикам. Такая стратегия не лишена резона. В 1983 году немецкие «зеленые» прорвались в бундестаг на волне протестов против размещения в Западной Германии американских «першингов».

Повествуя о нынешних пацифистах нельзя обойти вниманием один весьма щекотливый аспект – своими акциями пацифисты невольно играют на руку Саддаму. Мне довелось участвовать минимум в трех антивоенных акциях на Западе, и каждую иракское посольство использовало для укрепления престижа Саддама. Если в 60-е годы вьетнамский лидер, дядюшка Хо вызывал еще какие-то симпатии (все-таки заслуженный борец с колониализмом), то Саддам, как не крути, – кровавый диктатор.

Если пацифисты своевременно не продекламируют себя противниками Саддама, им грозит жалкая участь. Можно превратиться в банальных антиамериканистов, вроде Проханова или красноярских школьников, которые, как пишут в сетевых СМИ, отказываются посещать занятия английского, поскольку это язык американских оккупантов. ■

СПОРТОБЗОР

Последний выстрел

Воспринимать итоги чемпионата мира по биатлону можно по-разному. Очевидно одно – максималисты из среды поклонников белорусской сборной явно разочарованы. Ведь результаты, демонстрируемые нашими спортсменами на протяжении всего сезона, вполне позволяли рассчитывать на богатый урожай медалей, в том числе и высшей пробы. А итоги оказались отнюдь не столь впечатляющи. С другой стороны, если воспринимать происходящее с более реалистичных позиций, то чемпионат для белорусов прошел весьма успешно.

В преддверие чемпионата специалисты высказывались о шансах спортсменов весьма осторожно. Помимо того, что крупные соревнования всегда непредсказуемы (тем более в таком виде спорта), дополнительным фактором, не располагавшим к точным прогнозам, были сроки проведения мирового первенства. Впервые чемпионат проводится так поздно, в середине марта. Как следствие, довольно сложно было предсказать, как пауза в соревнованиях скажется на состоянии спортсменов и уровне их готовности. Вполне логичным было предположение, что перерыв в соревнованиях на финише тяжелого сезона многих выбьет из спортивного ритма. Скорее всего, именно в такую ситуацию и попали многие спортсмены, и не только наши. Достаточно вспомнить неудачные выступления Бьерндалена или представительниц женской команды Германии.

Оценивая выступление белорусской сборной, не стоит забывать и о том, что представляла собой эта команда еще в прошлом сезоне. Еще на Олимпиаде нынешние результаты, которые многие считают не самыми выдающимися, были бы расценены несомненным успехом. Так что два призовых места в Ханты-Мансийске – огромный шаг вперед. Не стоит забывать и о четвертых-пятых местах, каковые, учитывая конкуренцию в современном биатлоне, также есть немалое достижение.

Если же принять во внимание, что биатлонный сезон длится не один месяц, то стоит учитывать успехи нашей команды в этом году невзирая на локальные неудачи мирового первенства. В этом смысле выступление белорусов можно оценивать исключительно в превосходных степенях. Впечатляет выигрыш нашей мужской эстафетной командой хрустального кубка, вручаемого победителям в этой дисциплине. Даже третьего места на чемпионате, учитывая вторую позицию россиян, нашим стреляющим лыжникам хватило для общей победы. В итоге наш перевес над восточными соседями вылился лишь в одно очко. Впечатляют и личные показатели наших лидеров, прежде всего Владимира Драчева. В итоговом протоколе Кубка мира в спринте он стал третьим, четвертым в гонке преследования, вторым в массовом старте, а в индивидуальной гонке – шестым. Согласитесь, результаты весьма впечатляющие, и, как следствие, у Владимира вторая позиция в итоговом протоколе Кубка мира. Впереди него лишь Оле-Эйнар Бьерндален, соперничать с которым сейчас практически невозможно. Немногим хуже результаты у Елены Зубриловой. Заняв вторую позицию в гонке преследования и третью в индивидуальной гонке, в общем зачете она стала пятой. Остальные представители нашей сборной выступали похуже, хотя тот же Рыженков практически во всех номинациях попал в десятку.

Отличительной чертой нашей сборной в этом сезоне стала то, что к уровню лидеров постоянно подтягиваются остальные члены команды, что вылилось в высокие места, завоеванные нашими спортсменами в Кубке наций. Мужчины стали четвертыми, а женщины пятыми. На этом биатлонный сезон можно считать завершенным. Нам же остается лишь с нетерпением ожидать старта следующего, где белорусской сборной будет необходимо решить гораздо более сложную задачу: удержать завоеванные позиции и по возможности их улучшить.

Новые лица

Второй этап чемпионата мира по автогонкам в классе «Формула-1», как и первый, принес не самые ожидаемые результаты, подтверждая тем самым правоту инициаторов изменений в правилах. Интриги явно прибавилось. Другое дело, сколько так будет продолжаться. Ведь вполне возможно, что лидеры в скором времени приноровятся к новым условиям, и все вернется на круги своя. Однако все это возможно лишь в неопределенном будущем, пока же очевидно, что каждая гонка способно принести совершенно неожиданные результаты.

После двух этапов очевидно одно – главная цель межсезонных нововведений достигнута: безальтернативный лидер двух предыдущих сезонов пока имеет лишь одно место на подиуме, которое завоевал в Куала-Лумпуре, на автодроме «Сепанг» Баррикелло (он закончил гонку вторым). А пятикратный чемпион мира Михаэль Шумахер, чьи постоянные победы многих начали раздражать, на этот самый подиум никак взобраться не может. Но поклонники великого немца не склонны придавать этому слишком большое значение. Как-никак сезон только начинается и, по их мнению, Михаэль свое веское слово еще скажет.

Пока же на ведущие позиции выдвинулся «Макларен». Правда, завоевать два призовых места, как это было в первой гонке, прославленной команде не удалось. Дэвид Култард уже на третьем круге покинул трассу из-за проблем с электроникой. Зато его напарник Кими Райконен пришел к финишу первым. Таким образом, «Макларен» по итогом двух гран-при создал в Кубке конструкторов неплохой задел над «Феррари». И если английская команда продолжит в том же духе, то это будет первым шагом к восстановлению былой славы.

Из остальных результатов Гран-при Малайзии особо стоит отметить успех Фернандо Алонсо. Этот молодой пилот стал первым испанцем, завоевавшим поул, и первым представителем своей нации, поднявшимся на подиум со времен далекого 1956 года. Кроме того, это была первая победа «Рено» в квалификации со времени ее возвращения в «Формулу-1». Все это стало возможно исключительно благодаря правильной стратегии, так как по ходу гонки было совершенно очевидно, что «Рено» проигрывает в скорости и «Макларену» и «Феррари». В итоге Фернандо пропустил вперед Райконена и Баррикелло, но все же сумел финишировать третьим, что еще раз подтверждает возможности, которые предоставил менее мощном командам новый формат гонок.

ТЕАТР

Квартирный вопрос для Мастера и Маргариты

НИКОЛАЙ КОРНЕЙЧУКОВ

На один вечер спектакль «Мастер и Маргарита» в постановке Олега Киреева обрел сцену Театра-студии киноактера. Вполне возможно, что скоро своеобразная работа студентов третьего курса Академии искусств появится в репертуаре одного из минских театров.

Счет постановкам «Мастера и Маргариты» открыл в 70-е годы прошлого века Юрий Любимов. Собрав декорации из других своих спектаклей (на сценическое воплощение крамольного романа Михаила Булгакова не было выделено ни копейки), знаменитый режиссер театра на Таганке противопоставил искусство всемогущей системе.

Спектакль вызвал огромный резонанс, став символическим подтверждением того, что *«рукописи не горят»*. Эта первая постановка, сплошь да рядом экспериментальная по форме, замечательна бережным следованием булгаковскому тексту.

Под ногами наших актеров-третьекурсников пока что нет постоянной театральной сцены, а значит – нет и никакой возможности экспериментировать. Да и фон для восприятия «Мастера и Маргариты» далеко не тот, что был во времена Любимова. Но роман Булгакова потому и велик, что существует вне всякого фона, вне всякого времени и пространства – сам по себе. Его постановка считается крайне сложной, потому-то, вероятно, и нет до сих пор удачной экранизации похождений мессира Воланда в Москве.

Студенческий спектакль получился смелый и динамичный, хотя и не без изъянов. Впрочем, получился – это написано преждевременно. В теперешнем состоянии постановка пока еще напоминает полуфабрикат. Хорош Владимир Божков, играющий Ивана Бездомного и Иешуа Га-Ноцри. Пожалуй весьма оригинальное режиссерское решение – совместить исполнение этих ролей. Вместе с динамизмом в спектакле присутствует какая-то суетность, которой (самое обидное!) подвергается Воланд. В Артемии Гудинове не чувствуется *«той силы, что вечно жаждет зла и вечно совершает благо...»*

Оригинальная компановка булгаковского текста, интересные световые решения и некоторые «фишки» постановки делают спектакль заметным на общем фоне столичной театральной жизни. На молодых актеров уже обратил внимание Центр современной драматургии и режиссуры. Но было бы странно видеть в его репертуаре этот достаточно монументальный спектакль.

Пресловутый квартирный вопрос, не позволяющий студентам сделать постановку цельной и законченной, должен быть решен. Ведь «Мастер и Маргарита» – спектакль не для театра передвижников, а для театра подвижников. ■

НАТАТКІ

Нямецкая свабода...

Заканчэньне. Пачатак на стар. 1

высадят, и вам придется делать транзитную визу там, либо заставят штраф огромный платить. Можете и здесь ее сделать, но я лично не знаю, где у нас посольство Польши находится!

На гэтым месцы вочы вылупіліся ў мяне, бо жывучы ў Беларусі цяжка ня ведаць, што аніякіх візаў Польшча пакуль што не ўвяла.

Яшчэ адна супрацоўніца паспрабавала праліць крыху сьвятла, нясьмела зазначыўшы: *«Марина, там еще не ввели ничего, только собираются»*.

Урэшце Марына перакапала маю каляжанку пацікавіцца авіяквіткамі і пачала шукаць іх у кампутары. Я, зь якой размову пакуль яшчэ як быццам ня скончылі, зь цікавасьцю чакала, пакуль пра мяне ўзгадаюць. Нарэшце я дачакалася, і Марына паклікала яшчэ адну супрацоўніцу, каб тая занялася мной. Я распачала распавяд пра патрэбныя рэйсы, даты і г. д. зноў-ку. На Менск у цікавы мне дзень аўтобусаў не было, і Вольга, так звалі маю суразмоўцу, прапанавала Берасьце.

– Колькі будзе каштаваць? – запыталася я.

– *Официально*, – тут дзяўчына зрабіла выразную паузу, – *83 евро*.

Я, калі шчыра, разгубілася: як разумець *«афіцыйна»*?

– *Понимаете, если бы вы ехали туда и назад, он бы стоил 83. Но вы едете только в одну сторону, и если мы продадим вам его за 83, то наша фирма ничего на этом не заработает. Поэтому в таком случае, как ваш, мы накидываем сверху еще 20, чтобы не остаться в убытке.*

Шакавана вымавіўшы «я падумаю», пераапрацоўваючы ўражаньні апошніх 15 хвіляў знаходжаньня ў татальна савецкай *«конторе»*, я вярнулася да каляжанкі Гульнары, якая папросту з жахам пазірала на жанчыну, якая прапаноўвала ёй нейкія вельмі ўдалыя, на ейную думку, варыянты палётаў да Бішкеку. Праўда, яны ляцелі ці праз тыдзень пасьля сканчэньня нашай праграмы ў Гановэры, ці за 2 тыдні перад гэтым самым завяршэньнем.

Перад тым як разьвітацца, Гульнара задала ўсё ж пытаньне, зь якім мы наагул прыйшлі сюды: «Дык усё ж скажыце мне, колькі каштуюць квіткі на аўтобус да Бішкеку?»

Жанчына паглядзела на яе зь відавочным жалем: маўляў, так нічога дзяўчо і не зразумела, прагне арыштаў у Польшчы і штрафаў.

– *А мы не торгуем билетами до Киргизии*, – адказала яна.

– Як гэта не гандлюеце?! – ледзьве вымавілі мы ад зьдзіўленьня. – Мы ж да вас прыйшлі толькі з-за абвесткі ў газэце пра квіткі да Кіргізіі і іншых краін СНД.

– *Правда? Да не может быть! Это ошибка какая-то...* – і гэта была ўся рэакцыя, якую выказала жанчына.

Вось вам і *«Районка»*, вось вам і «нашыя» ў Нямеччыне. Дык які ж сэнс ехаць туды, дзе адкрываюцца новыя далягляды для кар'еры, дзе свабодна дыхаецца і ніхто не замінае расьці й шырэць твайму бізнэсу, каб працаваць яшчэ й горай, чым на радзіме? Выглядаць – гэтак сама, як на радзіме?

(Працяг будзе)

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

Дзённік Фердынанда Рушчыца

НАТАША СЯРГЕЕВА

